**#Дзень роднай мовы #Беларусь**

**Інтэлектуальная гульня-конкурс «Беларусь МАЯ»**

Далучэнне школьнікаў да здабыткаў нацыянальнай культуры (7–8 класы)

**Ламака Ірына Аляксандраўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
Казлоўшчынскай СШ Дзятлаўскага раёна
**Цімафейчык Іна Віктараўна,**
бібліятэкар
другой кваліфікацыйнай катэгорыі
Казлоўшчынскай СШ Дзятлаўскага раёна

**Беларуская мова – песенная і паэтычная, старажытная і сучасная. Раскрыць і данесці яе багацце да сучасных вучняў дазваляе правядзенне Тыдня беларускай мовы і літаратуры, падчас якога школьнікі актыўна ўдзельнічаюць у разнастайных мерапрыемствах. На працягу тыдня навучэнцы разгадваюць рэбусы «Скарбонка мудрасці», удзельнічаюць у конкурсах «Загадкі з роднай хаткі», «Знайдзі сябра», у выставе малюнкаў «Мая Беларусь», батле «Я ведаю!», конкурсе чытальнікаў «Прызнаемся слову ў каханні», акцыях «Далучы далонь», «Куфэрак пажаданняў», а таксама ў інтэлектуальных гульнях.**

**Прадстаўляем вашай увазе інтэлектуальную гульню-конкурс «Беларусь МАЯ».**

**Інтэлектуальная гульня-конкурс «Беларусь МАЯ»**

Далучэнне школьнікаў да здабыткаў нацыянальнай культуры (7–8 класы)

**Ламака Ірына Аляксандраўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
Казлоўшчынскай СШ Дзятлаўскага раёна
**Цімафейчык Іна Віктараўна,**
бібліятэкар
другой кваліфікацыйнай катэгорыі
Казлоўшчынскай СШ Дзятлаўскага раёна

**Беларуская мова – песенная і паэтычная, старажытная і сучасная. Раскрыць і данесці яе багацце да сучасных вучняў дазваляе правядзенне Тыдня беларускай мовы і літаратуры, падчас якога школьнікі актыўна ўдзельнічаюць у разнастайных мерапрыемствах. На працягу тыдня навучэнцы разгадваюць рэбусы «Скарбонка мудрасці», удзельнічаюць у конкурсах «Загадкі з роднай хаткі», «Знайдзі сябра», у выставе малюнкаў «Мая Беларусь», батле «Я ведаю!», конкурсе чытальнікаў «Прызнаемся слову ў каханні», акцыях «Далучы далонь», «Куфэрак пажаданняў», а таксама ў інтэлектуальных гульнях.**

**Прадстаўляем вашай увазе інтэлектуальную гульню-конкурс «Беларусь МАЯ».**

**Мэта:** прыцягненне ўвагі вучняў да неабходнасці захавання роднай мовы, нацыянальнай культуры, традыцый.

**Задачы:** пашыраць веды вучняў пра сваю Радзіму;

спрыяць выхаванню гонару і глыбокай павагі да нацыянальнай культуры;

развіваць пазнавальную актыўнасць і творчыя здольнасці;

фарміраваць навыкі работы ў камандзе.

**Абсталяванне:** мультыборд ці камп’ютар, прэзентацыя з гульнёй, ацэначныя лісты для журы, сігнальныя карткі, падарункі для пераможцаў.

**Прэзентацыя:**

https://docs.google.com/presentation/d/1VyibDV9KsD4QCJ09_mXpJHRNxKRkCXUS/edit?usp=sharing&ouid=113907241496591981727&rtpof=true&sd=true

**Афармленне дошкі:** беларускія саматканыя ручнікі, выказванні беларускіх класікаў пра родную старонку.

**Эпіграф:**

Хіба можна кут не любіць,
Дзе твае нарадзіліся бацькі,
Дзе жыццё пражылі дзяды,
Дзе спрадвеку твае карані?
Пятрусь Броўка

**Правілы гульні-конкурсу:** навучэнцы дзеляцца на 2–3 каманды, выбіраюць капітана. Па чарзе выбіраецца тэма пытання, а таксама яго «кошт». На абдумванне адказу даецца 30 секунд. Калі каманда не дае правільнага адказу, магчымасць адказаць пераходзіць да сапернікаў.

## Ход гульні-конкурсу

**І. Уступная частка**

Настаўнік вітае ўдзельнікаў, знаёміць з мэтамі, правіламі гульні, эпіграфам.

**II. Асноўная частка**

Вядучы абвяшчае ўдзельнікам катэгорыі пытанняў: «Беларусь гістарычная», «Беларусь літаратурная», «Беларусь краязнаўчая», «Беларусь фальклорная», «Беларусь геаграфічная», «Беларусь сучасная».

Шляхам жараб'ёўкі ўстанаўліваецца чарговасць адказаў каманд.

| Катэгорыя | Кошт пытання | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Беларусь гістарычная** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| **Беларусь літаратурная** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| **Беларусь краязнаўчая** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| **Беларусь фальклорная** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| **Беларусь геаграфічная** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| **Беларусь сучасная** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |

**Катэгорыя «Беларусь гістарычная»**

10 б. Як называўся вандроўны лялечны тэатр, які ўяўляў сабою двухпавярховую скрынку з дзверцамі?



Адказ: батлейка.

20 б. Назавіце манаскае імя полацкай князёўны Прадславы, якая з’яўляецца нябеснай заступніцай Беларусі.

Адказ: Ефрасіння.

30 б. Калі горад Мінск быў вызвалены ад гітлераўскіх захопнікаў?



Адказ: ліпень 1944.

40 б. Назавіце адно са знакамітых месцаў Беларусі, сімвал савецкага супраціўлення ў час Вялікай Айчыннай вайны. У гонар абаронцаў гэтага ўмацавання быў узведзены грандыёзны мемарыяльны комплекс, у цэнтры якога ўстаноўлены манумент «Мужнасць» вышынёй 33,5 м з выявай воіна і сцяга.

Адказ: Брэсцкая крэпасць.

50 б. Адзін з самых вядомых прадстаўнікоў свайго роду. Вялікі літоўскі гетман, прэтэндэнт на карону Рэчы Паспалітай. Мастак і цудоўны музыкант. Самы вядомы створаны ім паланез «Развітанне з Радзімай» носіць яго імя.

Адказ: Міхаіл Клеафас Агінскі.

**Катэгорыя «Беларусь літаратурная»**

10 б. Устаўце ў вершаванай страфе Янкі Купалы прапушчаныя словы:

Ад прадзедаў … вякоў,
Мне засталася … ,
Паміж сваіх і …
Яна мне … матчынай.



Адказ: … спакон… , … спадчына… , … чужакоў… , … ласкай… .

20 б. Назавіце імя і прозвішча вядомага ў свеце беларускага пісьменніка, аўтара твораў «Незагойная рана», «Знак бяды», «Жураўліны крык».

Адказ: Васіль Быкаў.

30 б. Які твор Якуба Коласа называюць «энцыклапедыяй сялянскага жыцця беларусаў»?



Адказ: паэма «Новая зямля».

40 б. У якім горадзе нарадзіўся Максім Багдановіч?



Адказ: У Мінску.

50 б. Які польскі паэт лічыў беларускую мову найбольш мілагучнай сярод славянскіх моў?

Адказ: Адам Міцкевіч.

**Катэгорыя «Беларусь краязнаўчая»**

10 б. Птушка-сімвал Беларусі.

Адказ: бусел.

20 б. Назавіце выраб, які ткуць на кроснах і аздабляюць традыцыйнымі ўзорамі. Яго найбольш распаўсюджаныя памеры: даўжыня 1,5–3 м, шырыня – 25–30 см.

Адказ: ручнік.

30 б. Сын Рагнеды і кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча.



Адказ: Ізяслаў.

40 б. Знайдзіце «чацвёртае лішняе» – тое, што абазначае прадмет, які беларускія кавалі не выраблялі: *бязмен, кубелец, сякера, цвік.*

Адказ: кубелец -- бандарны выраб.

50 б. Назавіце традыцыйныя рамёствы нашых продкаў.

Адказ: ткацтва, лозапляценне, саломапляценне, кавальства, бондарства, ганчарства.

**Катэгорыя «Беларусь фальклорная»**

10 б. Якое народнае свята стала асновай псеўданіма пісьменніка?

Адказ: Купалле – Янка Купала.

20 б. Які бог, паводле старажытных уяўленняў, з'яўляецца гаспадаром дажджоў, маланак і навальніц, апекуном земляробства?



Адказ: Пярун.

30 б. Назавіце выраб з саломы, які вывешваўся на самым ганаровым месцы дома. Яму прыпісвалі здольнасць збіраць у сабе «злыя сілы»: сурокі, праклёны, чараўніцтва і да т.п. У дзень вясновага раўнадзенства яго спальвалі.

Адказ: павук.

40 б. Як называецца восеньскае свята народнага календара, звязанае з памінаннем продкаў?



Адказ: Дзяды.

50 б. Назавіце вясновае свята народнага календара, якое прыпадае на 22 сакавіка. Лічылася, што ў гэты дзень прылятае з выраю 40 птушыных чародаў.

Адказ: Саракі.

**Катэгорыя «Беларусь геаграфічная»**

10 б. Назавіце старажытны беларускі горад, які ўзнік ля ракі Палаты.

Адказ: Полацк.

20 б. Колькі абласцей уваходзіць у склад Рэспублікі Беларусь? Назавіце іх.

Адказ: 6 абласцей. Гродзенская, Гомельская, Магілёўская, Віцебская, Мінская, Брэсцкая.

30 б. З якімі краінамі мяжуе Беларусь?



Адказ: Расія, Украіна, Польшча, Літва, Латвія.

40 б. Назавіце найбуйнейшае возера Беларусі, якое займае першае месца сярод азёр нашай радзімы па празрыстасці і чысціні. Дзе яно знаходзіцца?



Адказ: Нарач. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці.

50 б. У якое мора ўпадае Заходняя Дзвіна?



Адказ: у Балтыйскае мора.

**Катэгорыя «Беларусь сучасная»**

10 б. Назавіце, якая вядомая ўстанова нашай Радзімы адлюстравана на фотаздымку.



Адказ: Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

20 б. Назавіце 5 сучасных беларускіх брэндаў.




Адказ: Атлант, БелАЗ, МАЗ, МТЗ, Нафтан, Камунарка, Спартак, Світанак, Мілавіца, Керамін, Палессе, Беліта, Бабуліна крынка.

30 б. Пастаўце літары ў патрэбнай паслядоўнасці і назавіце сучасную назву ганчарных вырабаў: ЕКРАКМАІ.

Адказ: кераміка.

40 б. Назавіце нацыянальны парк на тэрыторыі Віцебскай вобласці, створаны ў 1995 годзе з мэтай захавання вядомага азёрнага комплексу.



Адказ: Браслаўскія азёры.

50 б. Унікальны помнік нацыянальнай культуры, удзельнік усіх войнаў, якія зведала наша шматпакутная зямля. Яго не раз разбуралі, палілі, бралі штурмам. У Другую сусветную вайну фашысты стварылі тут лагер для ваеннапалонных. А пры адступленні спалілі ўсё, што гарэла.

Адказ: Мірскі замак.

**III. Падвядзенне вынікаў гульні. Узнагароджванне пераможцаў**

– Мы ганарымся сваёй краінай, яе гісторыяй, ганарымся тым, што на нашай зямлі жывуць добразычлівыя, гасцінныя, дружныя, працавітыя, шчырыя, чулыя, цудоўныя людзі, імя якім – беларусы.

– Беларусь – наша маці і мова, паветра і хлеб!

Усімі ўдзельнікамі выконваецца песня «Мая Беларусь» (музыка і словы Анатоля Чэпікава).

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Беларусь : энцыклапедычны даведнік / рэдкал. : Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл, 1995. – 800 с.

3. Броўка, П. Збор твораў : у 9 т. / П. Броўка. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 4 : Вершы, паэма 1965 – 1972. – 591 с.

4. Купала, Я. Роднае слова: вершы, паэмы, п’есы: для сярэд. і ст. шк. Узросту / Янка Купала; уклад. Віктара Шніпа. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 257 с.

5. Республика Беларусь : энциклопедия: в 6 т. / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Минск : Белорус. Энцикл., 2005. – Т. 1 – 1040 с.